*Т.М.Бабіч*

# ВЫКАРЫСТАННЕ МАНДАЛІНЫ Ў ОПЕРЫ ЗАХОДНЕЕЎРАПЕЙСКІМІ КАМПАЗІТАРАМІ XVIII ст.

Музыка для мандаліны як самастойная з’ява ў сусветным музычным мастацтве недастаткова вывучана і прааналізавана. Але захаваныя да нашых дзён музычныя творы сведчаць аб высокіх мастацкіх, тэхнічных і выканальніцкіх магчымасцях інструмента, папулярнасці мандаліны сярод кампазітараў і музыкантаў розных часоў, павазе да гэтага інструмента. Недастаткова даследаваным застаецца і гістарычны аспект з’яўлення ў сусветным музычным мастацтве мандаліны[1].

У айчыннай музыказнаўчай літаратуры вядомы некалькі прыкладаў музычных твораў, напісаных спецыяльна для мандаліны заходнееўрапейскімі кампазітарамі XVIII ст. з улікам твораў опернага жанру. У пошуку музычнага матэрыялу мы выкарыстоўвалі звесткі замежных крыніц [1–4].

Як сведчаць даследчыкі, на працягу XVIII ст. для мандаліны быў створаны багаты і цікавы рэпертуар. Але, на жаль, многія музычныя творы да нашых дзён не захаваліся, і мы маем аб іх толькі некаторыя звесткі. Менавіта тады была створана своеасаблівая энцыклапедыя “залатога” рэпертуару для мандаліны. Гэта шматлікія санаты, трыо, квартэты, канцэрты, напісаныя італьянскімі, аўстрыйскімі, нямецкімі кампазітарамі. Мандаліну, як вельмі яскравы тэмбравы і каларыстычны інструмент, уключалі ў оперы і араторыі.

Упершыню мандаліна прагучала на сцэне музычнага тэатра ў канцы XVII ст. Але звесткі аб назве твора і імёнах кампазітараў не захаваліся.

Мандаліна ў творчасці многіх заходнееўрапейскіх оперных кампазітараў XVIII ст. займае асаблівае месца. У оперы яна выкарыстоўваецца як obbligato[2] і як яскравы тэмбравы і каларыстычны інструмент. Выконваючы функцыю obbligato, мандаліна з’яўлялася саліруючым музычным інструментам, што суправаджаў сольныя спевы ў арыі. Абапіраючыся на матэрыял замежных крыніц, можна прывесці некаторыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыклады. Аднак гэтыя звесткі адносна музычнага рэпертуару для мандаліны з'яўляюцца няпоўнымі. У іх іншы раз адсутнічаюць поўнае імя кампазітара ці нават назва і жанр твора. Але захаваныя адзінкавыя прыклады з'яўляюцца безумоўна каштоўнымі, бо з некаторымі музычнымі творамі мы знаёмімся ўпершыню, паколькі ў рускамоўных крыніцах гэта інфармацыя адсутнічае. Вось імёны малавядомых кампазітараў XVIII ст., якія ўключалі мандаліну ў свае оперы: Конці (F.B.Conti "Il Gioseffo", 1706; "Il trionfo dell'amidzia", 1711; "Galatea vendicata", 1719), Франчэска Мансіні (Francesco Mancini "Alessandro il grande in Sidone", 1706), Іаган Фукс (Fux[3] "Diana placata", 1717), Антоніо Лоці (Antonio Lotti[4], опера "Феафан" была пастаўлена ў Дрэздэне ў 1719 г.), Франчэска Гаспарыні (Francesco Gasparini "Lucio vero", 1719), Леанарда Вінчы (Leonardo Vinci[5] "La Contesa de' Numi", 1729), Хасэ (Hasse[6] "Ахіл на Скірасе", 1759) і Рынальда ды Капуа (Rinaldo di Capua "La donna vendicativa", 1771) [4, с. 967].

Мандаліна трапляе ў аркестр опернага тэатра ў пачатку XVIII ст. Першым, хто ўвёў мандаліну ў свае творы для опернага тэатра, быў італьянскі кампазітар канца XVII – першай чвэрці XVIII ст. Антоніо Марыя Бананчыні[7]. У яго оперы "Іспанскія заваяванні Сцыпіёна Афрыканскага" (1707) мандаліна гучыць у якасці акампаніруючага інструмента ў арыі. У замежных крыніцах [2, 4] прыводзіцца імя яшчэ аднаго італьянскага кампазітара і дырыжора – Антоніо Кальдара[8]. Як сцвярджаюць замежныя даследчыкі, Антоніо Кальдара ўключаў мандаліну ў свае оперы і араторыі. На жаль, нотнага запісу гэтых твораў нашы айчынныя музычныя фонды не маюць. Мы нават не ведаем, як дакладна яны называліся.

Першым з оперных кампазітараў у Германіі, які выкарыстоўваў мандаліну ў сваім творы, быў Іаган Готліб Наўман[9]. У яго оперы "Ахіл на Скірасе" мандаліна гучыць як акампаніруючы інструмент. Опера была напісана ў 1767 г. для італьянскага опернага тэатра ў Палерма.

У Англіі мандаліна ўпершыню загучала ў оперы "Альмена" (1764) англійскага кампазітара другой паловы XVIII ст. Майкла Арна[10]. Тут мандаліна гучыць у якасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

акампаніруючага інструмента ў арыі “No fears alarm” (“Трывога без страху”).

Як характэрны “серэнадны інструмент” мандаліна гучыць у оперы французскага кампазітара Андрэ Грэтры[11] “Раўнівы закаханы” (1778), у арыі “Кожны – прытворшчык”. Кампазітар уводзіць ансамбль у складзе струннага квінтэта (дзве скрыпкі, два альты і віяланчэль) і дзвюх мандалін, якія іграюць ва унісон. Тут для мандаліны кампазітар выкарыстоўвае тэхніку tremolando, што зусім незвычайна для такога ранняга перыяду.

Адзін з буйнейшых оперных кампазітараў Італіі другой паловы XVIII – пачатку XIX ст. Джавані Паізіела[12] быў запрошаны ў Пецярбург, дзе працаваў у якасці прыдворнага кампазітара з 1776 г. па 1784 г. У Расіі кампазітарам было напісана і пастаўлена каля дзесяці опер і інтэрмедый, якія ставіліся ў прыдворным тэатры, а таксама ў гарадскіх тэатрах. Многія з яго опер былі напісаны на вядомыя літаратурныя сюжэты. Так, адна з самых вядомых опер кампазітара “Севільскі цырульнік, ці Дарэмная засцярога” створана на сюжэт аднайменнай камедыі (1773) французскага драматурга П.Бамаршэ (1732–1799). Опера “Севільскі цырульнік” была напісана ў Расіі ў 1782 г. і пастаўлена на сцэне прыдворнага тэатра ў Пецярбургу. У гэтай оперы кампазітар уводзіць мандаліну як акампаніруючы інструмент.

У другой палове XVIII ст. мандаліна атрымлівае шырокае распаўсюджанне ў краінах Заходняй Еўропы і набывае папулярнасць як акампаніруючы інструмент пры выкананні серэнады. Менавіта гэты музычны інструмент з яго мяккім і пяшчотным гучаннем здольны перадаць багаты пачуццёвы ўнутраны свет закаханага героя. Так лічылі многія кампазітары XVIII ст., калі ўводзілі мандаліну ў свае оперы. Серэнада становіцца амаль абавязковым нумарам у операх Ан- дрэ Грэтры “Раўнівы закаханы” (1778), Джавані Паізіелы “Севільскі цырульнік” (1782), Антоніо Сальеры[13] “Аксур, цар Армуза” (1788).

Найбольш вядомы ў музычным мастацтве выпадак выкарыстання мандаліны ў оперы – “Канцанета” (“Серэнада”) з другога акта оперы В.А.Моцарта “Дон Жуан” (1787). Уводзя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чы мандаліну ў партытуру оперы, кампазітар, як падаецца, жадаў не толькі паказаць цікавасць да гэтага інструмента, але і засведчыць факт яго шырокага распаўсюджання ў заходнееўрапейскай музычнай культуры.

Разгледжаныя музычныя прыклады выкарыстання мандаліны ў оперы кампазітарамі розных краін не могуць быць поўна прааналізаваны па розных абставінах. Як мы адзначалі, у музычных фондах нашай краіны ні рэпрынтных выданняў, ні рэдакцый многіх з гэтых твораў няма, нават іх назвы не ўпамінаюцца. Таму ўсе факты, якія сведчаць аб выкарыстанні мандаліны ў музычных творах вышэйназваных аўтараў, даюцца са спасылкай на замежныя крыніцы.

---

[1]*Мандаліна* – струнны шчыпковы музычны інструмент лютневага сямейства. Інструмент з'явіўся на тэрыторыі Паўночнай Італіі на мяжы XVI–XVII стст.

[2]*Obbligato* – аблігата: а) назва партыі суправаджальнага інструмента ў ансамблевым музычным творы, выкананне якой з'яўляецца абавязковым; б) партыя саліруючага інструмента, які суправаджаў сольныя спевы ў арыях XVII–XVIII стст.

[3]*Фукс Іаган Йозэф (1660–1741)* – аўстрыйскі кампазітар, музычны тэарэтык, дырыжор і арганіст. У опернай творчасці выступіў як адзін з буйнейшых прадстаўнікоў аўстрыйскага барока. Аўтар шматлікіх твораў (выдадзена каля 500) – звыш 70 мес, некалькіх рэквіемаў, 57 вячэрань і псалмоў, 11 араторый, 18 опер, інструментальных твораў (сімфонія, сюіты для аркестра, трыо-санаты) і інш.

[4]*Лоці Антоніо (1667–1740)* – італьянскі арганіст і кампазітар. Аўтар опер (больш за 20), араторый, каля 50 кантат, каля 20 мес, матэтаў, псалмоў.

[5]*Вінчы Леанарда (1690–1730)* – італьянскі кампазітар, яскравы прадстаўнік неапалітанскай опернай школы. Аўтар каля 40 опер (опера "Пакінутая Дзідона", 1726; "Аляксандр у Індыі", 1729 і інш.), араторый, кантат, матэтаў, шматлікіх твораў царкоўнай музыкі.

[6]*Хасэ (ці Гасэ) Іаган Адольф (1699–1783)* – нямецкі кампазітар, адзін з вядучых майстроў оперы-seria. Аўтар 56



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

опер, 13 інтэрмедый. Ствараў таксама араторыі, месы, рэквіемы, псалмы, гімны, канцэрты для струнных інструментаў.

[7]*Бананчыні Антоніо Марыя (1677–1726)* – італьянскі кампазітар, скрыпач, дырыжор аркестра опернага тэатра. З'яўляецца адным з выдатных оперных кампазітараў канца XVII – першай чвэрці XVIII ст. Вядомыя яго оперы: "Арміній"(1706), "Луцый Вер"(1716) і інш. З'яўляецца аўтарам трох араторый, шматлікіх твораў царкоўнай музыкі.

[8]*Кальдара Антоніо (канец 1670–1736)* – італьянскі кампазітар і дырыжор. З'яўляецца адным з вядучых кампазітараў венскай оперы. Напісаў мноства опер, араторый, твораў царкоўнай і камернай музыкі. З'яўляецца выдатным майстрам вакальнай музыкі таго часу. Менш вядомы як аўтар інструментальнай музыкі.

[9]*Іаган Готліб Наўман (1741–1801)* – нямецкі оперны кампазітар. Ім напісаны 24 оперы. Ставіў свае оперы на сцэне многіх тэатраў свету. Працаваў у розных гарадах Італіі, Дрэздэне, Капенгагене, Стакгольме. Пісаў оперы на італьянскія тэксты ("Ахіл на Скірасе", 1767), на дацкай мове ("Арфей і Эўрыдыка", 1786), на шведскай мове ("Густаў Васа", 1786).

[10]*Майкл Арн (1740 ці 1741–1786)* – англійскі тэатральны кампазітар. Быў драматычным акцёрам, оперным спеваком, віртуозам ігры на арпсіхордзе – англійскім клавесіне. З 1756 г. пісаў тэатральную музыку, якая карысталася вялікім поспехам дзякуючы меладычнай прастаце і даступнасці зместу. Вядомыя яго оперы "Гіменей", "Альмена" (абедзве 1764), "Саймон" (1767) і інш.

[11]*Андрэ Эрнэст Мадэст Грэтры (1741–1813)* – французскі кампазітар, музычны пісьменнік.

[12]*Джавані Грыгорыо Катальдо Паізіела (1740–1816)* – італьянскі кампазітар, буйнейшы прадстаўнік неапалітанскай opернай школы. Ім створаны каля 100 опер (seria і buffa; некаторыя з іх маюць некалькі рэдакцый). Многія оперы напісаны на лібрэта, якія выкарыстоўваліся рознымі кампазітарамі.

[13]*Сальеры Антоніо (1750–1825)* – італьянскі кампазітар, дырыжор і выкладчык.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1.*Baker’s* Biographical Dictionary of Musicians / Ed. by Nicolas Slonimsky: In 6 v. – N.Y.: Schirmer Books, 2001.

2.*Campbell R.* Mandolin // The New Grove Dictionary of Music and Musicians / Ed. by S.Sadie: In 20 v. – London: Macmillan Publishers Limited, 1994. – V. 11. – P. 606–611.

3.*Renhard Kurt.* Mandola und Mandoline // Die Musik in Geschichte und Gegenwart: Allgemene Enzyklopädie der Musik begründet von Friedrich Biume / Herausgeb. von L.Finscher. – Kassel: S. 5. – P.966–967.

4.*Tyler J., Sparks P.* Mandolin // The New Grove Dictionary of Music and Musicians. – Second edition / Ed. by S.Sadie: In 21 v. – Oxford, England: Macmillan Publishers Limited, 2001. – V. 15. – P. 737–743.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*А.С.Белавусава*

## АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ РАЗВІЦЦЯ ГАНЧАРСТВА І ТКАЦТВА БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XX ст.

У канцы XIX – пачатку XX ст. у сувязі са зменай грамадска-палітычных і эканамічных умоў адбыліся змены і ў культурным жыцці Беларусі. Даволі складаныя эканамічныя абставіны паўплывалі на стан і развіццё дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Рамесніцкая вытворчасць паступова абмяжоўвалася фабрычнай. Майстры пачыналі пошук новых, выразных сродкаў, якія б адпавядалі зменлівым густам пакупнікоў. Народнае мастацтва ў гэты час адчувала пэўныя цяжкасці, выкліканыя канкурэнцыяй з фабрычнай прамысловасцю. Некаторыя рамёствы знікалі, іншыя працягвалі развівацца. У ліку апошніх можна назваць ганчарства і ткацтва, якія былі распаўсюджаны даволі шырока.

Асноўнае ў развіцці ганчарства і ткацтва ў пачатку XX в. – гэта новыя формы і ўзбагачэнне дэкору на аснове традыцый, якія складаліся стагоддзямі. Так, у ганчарнай справе ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу майстры імкнуліся ўзбагаціць дэкор сваіх вырабаў, пашырыць асартымент.